vhs
DVV International

# АНОНС

**Прадстаўніцтва зарэгістраванага аб’яднання «Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.» (ФРГ) у РБ паведамляе аб старце Праграмы падтрымкі вясковых ініцыятыў «Адукацыя дарослых і сельскае развіццё»**

***Мінск, 12.02.2015***

**Мэта праграмы:** ўмацаванне патэнцыялу вясковых ініцыятыў, якія ажыццяўляюць культурна-гістарычную і адукацыйную дзейнасць у сельскіх рэгіёнах.

**Магчымасці для ўдзельнікаў:**

- прыняць удзел у двух адукацыйных семінарах:
  - «Нефармальная адукацыя ў сельскай мясцовасці: ствараем адукацыйныя праграмы і НДА» (папярэдняя дата – 14-15 мая 2015 г.),
  - «Адукацыйная і культурна-гістарычная дзейнасць у вёсцы: ствараем праекты і бізнес-планы» (папярэдняя дата – 10-12 верасня 2015 г.);
- атрымаць кансультацыі юрыста па пытаннях стварэння і рэгістрацыі мясцовай недзяржаўнай арганізацыі (НДА);
- атрымаць зваротную сувязь на распрацаваныя праграмы, праекты і бізнес-планы ў галіне нефармальнай адукацыі і культурна-гістарычнай дзейнасці;
- атрымліваць інфармацыю пра цікавыя падзеі ў галіне развіцця сельскіх тэрыторый і дзяліцца сваімі навінамі;
- прыняць удзел у заключным Форуме вясковых ініцыятыў.

**Удзельнікі:** партнёрскія ініцыятывы, якія займаюцца адукацыйнай і культурна-асветніцкай дзейнасцю ў сельскай месцовасці і аддалёных рэгіёнах і плануюць зарэгістраваць сваю НДА. У выпадку вялікай колькасці заявак, перавага будзе аддавацца ўдзельнікам праекта «Жывая гісторыя майго краю».

Калі Вас зацікавіла дадзеная праграма і Вы плануеце прыняць у ёй удзел, дашліце, калі ласка, кароткае апісанне Вашай ініцыятывы (мясцовасць, асноўныя напрамкі дзейнасці) і дадзеныя кантактнай асобы (прозвішча, імя, кантактны тэлефон з кодам, e-mail) на адрас **living_history@dvv-international.by да 25 сакавіка 2015 г.,** каб мы маглі даслаць Вам больш падрабязную інфармацыю.

пр-т Газеты «Праўда», 11Г-12
220116, г. Мінск, Беларусь

Тэл.\факс: + 375 (17) 207 98 35
Маб. тэл.: + 375 (29) 171 93 97

email: living_history@dvv-international.by
www.dvv-international.by